АСАБЛІВАСЦІ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЖУРНАЛІСТА РАЁННАГА ВЫДАННЯ

А. І. Кунахавец-Плявака

Аснову рэдакцыі любога сродку масавай інфармацыі складаюць журналісты. Менавіта ад якасці іх працы залежыць, наколькі поўную інфармацыю аб сферах жыццядзейнасці грамадства атрымаюць чытачы, слухачы, гледачы ці інтэрнэт-карыстальнікі. У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» знаходзім наступнае тлумачэнне паняццю «журналіст»: «фізічная асоба, якая займаецца зборам, рэдагаваннем і стварэннем (падрыхтоўкай) інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў для юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, звязаная з гэтай юрыдычнай асобай працоўнымі або іншымі дагаворнымі адносінамі» [3]. Такім чынам, журналісцкую дзейнасць можна вызначыць як сукупнасць цесна звязаных і, разам з тым, адносна самастойных працэсаў збору, апрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі сярод спажыўцоў. Больш таго, журналістыка ў класічным разуменні гэтага паняцця – від творчай дзейнасці чалавека, бо ў яе аснове ляжыць здольнасць ствараць новае – тое, чаго раней не было.

Расійская даследчыца Г. В. Лазуціна вылучае наступныя віды журналісцкай дзейнасці: *арганізатарская*, якая «накіравана на арганізацыю духоўнага супрацоўніцтва ў грамадстве ў імя стварэння масавых інфармацыйных патокаў»; *дзейнасць мадэлявання*, падпарадкаваная задачы «выяўлення зместу і стварэння формы для тых ці іншых фрагментаў масавых інфармацыйных патокаў (нумар газеты, праграма радыё або тэлебачання)»; *дзейнасць рэдагавання*, мэта якой – «прывесці ўсе прыцягнутыя інфармацыйныя прадукты ў адпаведнасць з нарматывамі, якія забяспечваюць успрыманне іх масавай аўдыторыяй»; *уласна журналісцкая творчасць*, звязаная з падрыхтоўкай тэкстаў адмысловага выгляду, і *дзейнасць па выпуску масавых інфармацыйных патокаў* (дакладней, іх адпаведных фрагментаў) [2, с. 38]. Пры гэтым усе тыпы, стадыі і этапы журналісцкай працы ў рэальным жыцці пераплятаюцца і ўзаемадзейнічаюць, таму журналістыку (у адрозненне ад іншых відаў творчай актыўнасці чалавека) можна назваць шматграннай і цэласнай адначасова.

Да асноўных асаблівасцей журналісцкай дзейнасці традыцыйна адносяць комплекснасць, спалучэнне індывідуальнай і калектыўнай працы, творчай і вытворчай дзейнасці, аператыўнасці і бесперапыннасці, а таксама ўніверсальнасці са спецыялізацыяй. Вядома, праца на тэлебачанні, радыё, у газеце ці інтэрнэце падпарадкоўваецца сваім вытворчым умо-

вам. Пэўныя асаблівасці ёсць і ў рабоце творчых супрацоўнікаў перыядычных выданняў рознага кшталту. Перш за ўсё яны залежаць ад тыпу выдання, у якім журналіст выступае, а таксама ад яго месца ў рэдакцыі, пасады, якую ён займае (рэдактар, адказны сакратар, загадчык аддзела, карэспандэнт і інш.). У цэлым жа характарыстыкі рэдакцыі друкаванага перыядычнага выдання вызначаюцца шэрагам суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў: «Да суб'ектыўных фактараў адносяцца воля заснавальніка, уладальніка газеты, мэты, якія ён ставіць перад рэдакцыяй, рашэнні яе кіраўнікоў. Аб'ектыўнымі фактарамі з'яўляюцца рэальныя ўмовы, у якіх рэдакцыі прыходзіцца выпускаць газету, патрабаванні законаў, якія адносяцца да СМІ, нормы агульначалавечай і журналісцкай этыкі. І не ў апошнюю чаргу – асаблівасці журналісцкай працы» [1, с. 76].

Раённая газета – выданне па сваёй прыродзе ўнікальнае. І звязана гэта не толькі з геаграфічным прынцыпам размеркавання аўдыторыі, эксклюзіўнасцю мясцовай інфармацыі. Вядома, ёсць адрозненне і ў рабоце журналістаў «раёнкі». Па-першае, штат рэдакцыі такіх выданняў звычайна невялікі – тры-чатыры аддзелы па адным-два чалавекі. Шматфункцыянальнасць, спалучэнне розных відаў працы, а таксама хуткі пераход ад адных абавязкаў да іншых з'яўляецца, бадай што, важнейшай асаблівасцю творчай дзейнасці журналістаў мясцовага друку.

Традыцыйна ў раённай газеце, якая друкуецца два разы на тыдзень, ёсць чатыры аддзелы: аграрнай палітыкі і прамысловасці, пісьмаў і сацыяльных праблем, камп'ютарнай вёрсткі і фотаілюстрацый, рэкламы (назвы аддзелаў у залежнасці ад выдання могуць вар'іравацца). Дарэчы, некаторыя рэдакцыі сучасных беларускіх «раёнак» практыкуюць функцыянаванне асобных аддзелаў моладзі і журналісцкіх расследаванняў (бярозаўская раённая газета «Маяк»), эканомікі і экалогіі, права (баранавіцкая аб'яднаная газета «Наш край») і інш. Аднак гэта не азначае, што, напрыклад, загадчык аддзела аграрнай палітыкі і прамысловасці, калі ўзнікне вострая неабходнасць, не будзе пісаць пра праблемы людзей з абмежаванымі магчымасцямі ці фестываль маладзёжнай музыкі, што ўпершыню ладзіцца ў рэгіёне. Больш таго, як правіла, у рэдакцыях раённых газет няма аддзелаў інфармацыі, супрацоўнікі якога займаліся б выключна пошукам навін, таму ў абавязкі кожнага журналіста ўваходзіць падрыхтоўка кароткіх нататак.

Такім чынам, універсальнасць, адсутнасць вузкай спецыялізацыі – адметная асаблівасць творчай дзейнасці журналістаў раённага друку. Добра гэта ці не? Адназначнага адказу на гэтае пытанне, напэўна, няма і быць не можа, бо празмернае абмежаванне далягляду настолькі ж негатыўнае, як і журналісцкая «ўсяяднасць», якая часта становіцца пры-

чынай павярхоўнасці матэрыялаў, адсутнасці аналітыкі на старонках газет. Канешне ж, пэўную сферу жыцця грамадства журналіст павінен ведаць дасканала, аднак не для таго, каб з нумара ў нумар пісаць аб адным і тым жа, а каб лепш адчуваць перамены ў гэтай галіне, сачыць за тэндэнцыямі яе развіцця, блізка ведаць экспертаў, да якіх у любы момант можна было б звярнуцца за каментарыем. Вось чаму творчым супрацоўнікам мясцовых СМІ неабходны шырокая агульная эрудыцыя і прафесійнае ўменне аператыўна «дабіраць» неабходную інфармацыю па тэме.

Пастаяннае самаразвіццё і самаўдасканаленне – неад'емныя атрыбуты дзейнасці журналістаў любога сродку масавай інфармацыі, аднак асабліва значна і актуальна гэта для супрацоўнікаў мясцовага друку. Адным з недахопаў творчай дзейнасці журналістаў раённых газет застаецца жанравая аднастайнасць матэрыялаў, няпоўнае выкарыстанне творчых рэсурсаў разнастайных жанравых форм, іх аналітычных і вобразных магчымасцей. Публіцыстычны тэкст і форма падачы матэрыялаў на старонках мясцовага друку трансфармуюцца менш інтэнсіўна, чым, напрыклад, у агульнанацыянальных выданнях, і часта адстаюць ад патрабаванняў новых запытаў чытача. Таму журналістам рэгіянальных СМІ трэба працаваць над стылем сваіх публікацый і ў цэлым выдання, вучыцца ў майстроў слова, часцей заглядваць у слоўнік ці спецыяльную літаратуру.

Вядома, параўнальна невялікая колькасць творчых супрацоўнікаў у штатным раскладзе раённых газет кампенсуецца шырокім актывам пазаштатных карэспандэнтаў, якія дапамагаюць забяспечыць усебаковае інфармаванне чытачоў аб жыцці рэгіёна. «Журналіст раённай газеты, і ў гэтым заключаецца спецыфіка яго працы, выступае перш за ўсё як арганізатар, які забяспечвае выступленне ў газеце прадстаўнікоў партыйнага актыва раёна, працаўнікоў вёскі, прамысловасці, інтэлігенцыі» [4, с. 50]. Цесныя ўзаемаадносіны з чытачом – характэрная асаблівасць мясцовага друку. Перш за ўсё гэта абумоўлена статусам газеты рэгіёна: «раёнка» для жыхароў той ці іншай мясцовасці з'яўляецца самым блізкім выданнем, часта адзінай крыніцай інфармацыі аб тым, што адбываецца на прадпрыемствах, у сельгаскааператывах, на вуліцах вёсак и пасёлкаў, дзе жывуць простыя людзі. Журналісты раённага друку ведаюць сваіх чытачоў, блізка знаёмыя з імі і маюць магчымасць непасрэдна назіраць за рэакцыяй на той ці іншы матэрыял, могуць выявіць прычыны задаволенасці альбо, наадварот, абурэння. Аднак, як паказвае практыка, у супрацоўнікаў мясцовых выданняў не заўжды ёсць магчымасць арыентавацца выключна на запыты сваіх чытачоў. На жаль, і сёння, пасля адмены партыйнай манаполіі на друк,

створаная як інструмент улады, раённая газета захоўвае рысы афіцыёзнага выдання: практыка візавання газетных матэрыялаў у райвыканкаме настолькі цвёрда замацавалася ў паўсядзённым жыцці журналістаў «раёнкі», што мала ў каго атрымліваецца ёй супрацьстаяць.

Унутраны канфармізм і негатоўнасць (часта нават нежаданне) выходзіць за рамкі існуючай палітыка-эканамічнай залежнасці ад уладных структур не лепшым чынам адбіваецца на аўтарытэце самой газеты, аказвае негатыўны ўплыў на характар творчай актыўнасці супрацоўнікаў выдання. На пытанне: «Ці адчуваеце Вы націск “з боку” ў адносінах да выбару тэм для напісання матэрыялаў, спосабаў падачы інфармацыі?» 48,4 % журналістаў «раёнак» Брэсцкай вобласці падчас анкетавання, якое было праведзена ў студзені-лютым бягучага года, далі станоўчы адказ. Замест таго, каб друкаваць праблемныя і дыскусійныя матэрыялы, публікацыі аб простых людзях, рэдакцыі мясцовых газет вымушаны займаць значную плошчу выдання афіцыйнымі пастановамі, рашэннямі райвыканкама. І гэта пры тым, што 71,4 % рэдактараў раённых газет Брэстчыны ўпэўнены, што іх выданне здольна працягваць сваю дзейнасць без адпаведнай фінансавай падтрымкі.

Канешне, праблем у беларускіх «раёнак» і сёння дастаткова: закасцянеласць фармата, залежнасць ад мясцовых улад, недахоп прафесійных кадраў, адсутнасць праблемных публікацый, слабая матэрыяльна-тэхнічная база… Вядома, усё гэта адмоўна адбіваецца на якасці друку. Тым не менш, нягледзячы на ўсе адзначаныя цяжкасці і недахопы, раённая газета мае свайго чытача, пастаянна ўдасканальваецца работа рэдакцый: 59 % творчых супрацоўнікаў мясцовых выданняў Брэстчыны падчас апытання адзначылі, што за апошнія пяць гадоў функцыявання іх газета палепшылася ў плане афармлення і напаўнення. Журналісты лічаць, што іх выданні самыя чытаемыя, бо «раёнка» – гэта максімальная набліжанасць да праблем мясцовага насельніцтва. Паказальна, што для многіх творчых супрацоўнікаў рэгіянальных СМІ асноўнымі фактарамі матывацыі ў прафесіі сталі адчуванне ўласнай карыснасці, неабходнасць у самарэалізацыі, павага з боку блізкіх людзей і значнасць выконваемай работы. Выданням з такімі супрацоўнікамі, безумоўна, будзе забяспечана доўгае жыццё.

Літаратура

1. *Гуревич С.* Газета: вчера, сегодня, завтра. М., 2004. 288 с.
2. *Лазутина Г.* Основы творческой деятельности журналиста. М., 2001. 240 с.
3. Министерство информации Республики Беларусь: Законы и Указы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mininform.gov.by/ru/zakony-ru/. – Дата доступа: 11.04.2016.
4. Рабочая книга редактора районной газеты. М., 1988. 575 с.